3. *Мельник В.А.* Государственная идеология Республики Беларусь. Концептуальные основы. – Мн.: Тесей, 2003.

4. *Молодёжь* Беларуси на современном этапе: состояние, проблемы и пути их решения. – Мн., 2004.

5. *Новая* философская энциклопедия. – М., 2001. – Т.2.

6. *Яскевич Я.С.* Основы идеологии белорусского государства: мировоззренческие ценности и стратегические приоритеты. – Мн.: РИВШ БГУ, 2003.

**Ю.У. Міцкевіч**, *выкладчык*

## ВЫХАВАННЕ АСОБАСНАЙ КУЛЬТУРЫ Ў СТУДЭНТАЎ ЯК БУДУЧЫХ МАЛАДЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асобасная культура з'яўляецца вызначальнай часткай культуры чалавека. У сучасных умовах канкурэнтаздольнасць маладых спецыялістаў на рынку вакансій значна павышаецца, калі яны мэтанакіравана займаюцца фарміраваннем асобаснай культуры.

Сёння студэнты разумеюць, што неабходна атрымаць дыплом аб вышэйшай адукацыі не толькі дзеля фармальнасці, а каб на самай справе мець рэальную магчымасць працаваць па выбранай спецыяльнасці.

Аналіз перыядычных друкаваных выданняў сведчыць, што прафесійная гатоўнасць спецыялістаў да выканання непасрэдных абавязкаў вызначаецца шэрагам параметраў. Сярод дамінантных – належны комплекс ведаў, уменняў, навыкаў, вопыт работы, пазітыўныя асобасныя і прафесійныя якасці.

Вынікі нашага апытання сярод практыкаў-менеджэраў, кіраўнікоў арганізацый дазваляюць сцвярджаць, што пры першай сустрэчы з патэнцыяльным кандыдатам на вакантную пасаду звяртаецца ўвага, акрамя пералічанага вышэй, на асобасную культуру спецыяліста.

Навуковыя распрацоўкі Я.М.Бабосава, А.С.Зубры, Э.П.Пячорскай садзейнічалі вызначэнню крытэрыяў асобаснай культуры маладых спецыялістаў. Гэта:

– актыўная сацыяльная пазіцыя;
– устойлівая матывацыйная аснова дзейнасці;
– шырыня кругагляду;
– культура мовы;
– артыстычныя даныя;
– кіраванне стрэсаўстойлівымі сітуацыямі;
– пазітыўнае мысленне [1, 2, 3].

Праведзенае намі навуковае даследаванне ў студэнцкім асяроддзі кафедры менеджменту сацыякультурнай сферы БДУ культуры і мастацтваў дапамагло ахарактарызаваць найбольш значныя кампаненты асобаснай культуры. З іх мы перш за ўсё вылучаем актыўную сацыяльную пазіцыю і ўстойлівую матывацыйную аснову дзейнасці.

Так, калі гаворка ідзе пра актыўную сацыяльную пазіцыю маладых спецыялістаў, то маюцца на ўвазе іх жаданне ўзбагачаць свой вопыт новымі метадамі і формамі работы, цікавасць да інавацыйных працэсаў у грамадстве, ініцыятыўнае ўключэнне ў сацыяльныя праекты. Студэнты вельмі выбіральна адносяцца да знешніх уплываў. Будучыя маладыя спецыялісты паступова набываюць уменні і ацэнкі не толькі свайго асяроддзя, але і саміх сябе. Сведчаннем таго, што студэнты становяцца больш актыўнымі суб'ектамі сацыяльных узаемаадносін, з'яўляецца іх самастойны выбар суразмоўцаў, інтарэсаў і мэтанакіраваных дзеянняў. Маладыя спецыялісты пераўтвараюць сацыяльны вопыт і такім чынам пашыраюць свае магчымасці прафесійнага росту.

Не менш значнай з'яўляецца і матывацыйная аснова дзеянняў, якая характарызуе накіраванасць маладых спецыялістаў на дасягненне поспеху ў выбранай спецыяльнасці. Воля аб'ядноўвае іх патрэбнасці і жаданні з магчымымі дзеяннямі. Матывацыйная аснова можа быць як пазітыўная (заахвочванне дзеян-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

няў), так і негатыўная (прымус, страх перад непрыемнасцямі). Дыяпазон матываў дзейнняў маладых спецыялістаў даволі шырокі: перспектывы кар'ернага росту, прызнанне з боку кіраўніцтва ці калег, задавальненне асобасных амбіцый і інш. Матывы дзеянняў спецыялістаў бываюць як усвядомленымі, так і неўсвядомленымі. Для таго каб адбылося дзеянне, неабходна прыняць рашэнне ці актывізаваць волю. Такім чынам, матывацыйная аснова дзеянняў маладых спецыялістаў непасрэдна ўплывае на эфектыўнасць вынікаў іх працы.

Практыка пераконвае, што ў сучасных умовах фарміраванню асобаснай культуры маладых спецыялістаў садзейнічае наступнае:

– навучанне ў малых групах з выкарыстаннем такіх формаў працы, як трэнінгі, дзелавыя гульні, прэзентацыі, канферэнцыі з абавязковым вызначэннем сутнаснай асновы заняткаў;

– праца ў рэжыме самастойнага пошуку перспектыўных знаходак у выбранай сферы;

– фасілітацыйная аснова ўзаемадзеяння паміж студэнтамі і выкладчыкамі (своечасовая педагагічная падтрымка) і інш.

Каб стаць канкурэнтаздольным спецыялістам, студэнтам у працэсе вучобы ва універсітэце пажадана вызначыць шлях сваёй самарэалізацыі, трывалым падмуркам для якой служыць сфарміраваная асобасная культура.

Такім чынам, самарэалізацыі маладых спецыялістаў у прафесійнай дзейнасці дапамагае асобасная культура, якая з'яўляецца адначасова і іх канкурэнтаздольнай перавагай у сучасных умовах.

---

1. *Бабосов Е.М.* Общая социология: учеб. пособие для студентов вузов. – Мн.: ТетраСистемс, 2002. – 640 с.

2. *Зубра А.С.* Среда, растящая личность // Адукацыя і выхаванне. – 2000. – №8. – С.29–35.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. *Печёрская Э.П.* Концептуальные аспекты подготовки конкурентоспособного специалиста в современных условиях. – Самара: Самарская гос. экон. акад., 2003. – 260 с.

**М.А.Можейко,** *профессор*

## ФИЛОСОФИЯ В СИСТЕМЕ СОВРЕМЕННОЙ БЕЛОРУССКОЙ КУЛЬТУРЫ: ПРОБЛЕМА СОЦИАЛЬНОЙ МИССИИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Говоря о роли науки в современном обществе, как правило, имеют в виду достижения естествознания с их непосредственным выходом в сферу техники и технологии. Однако, отдавая дань практическому значению естественных дисциплин, нельзя не остановиться на той роли, которую играет в современном социокультурном контексте гуманитарная сфера знания, и в частности философия.

Усиление социального значения гуманитарных дисциплин в современных условиях связано прежде всего с тем, что возрастает роль собственно гуманитарной сферы в самом социальном процессе. Все большее воздействие на его скорость, направление и саму сущность оказывают факторы не только экономического, технологического, но и социального, культурного, идеологического характера.

Таким образом, духовная сфера общества оказывается важнейшим фактором исторического прогресса.

Именно развитие человеческой духовности, формы и механизмы разворачивания культурной традиции, раскрытия духовного потенциала той или иной национальной культуры и лежат в поле пристального внимания такой области философского знания, как философия культуры.

*Культура и мировоззрение: понятие стиля мышления эпохи.* Человек рождается человеком лишь потенциально: он